нар. песень і танцаў для розных выканальніцкіх складаў, у т.л. сімфанічнага і нар. аркестраў. Складальнік фалькл. зборнікаў «Беларускія народныя песні і танцы» (1949), «Беларускія народныя песні» (1959). Імя Ч. нададзена муз. школе ў Мсціслаўлі.

*Літ.*: Журавлев Д.Н. Большая дорога: Народный артист БССР Н.Н.Чуркин. Мн., 1964.

*Т. А. Дубкова.*

**ЧУРКО́** Юлія Міхайлаўна (н. 21.7.1936, С.-Пецярбург), балерына, мастацтвазнавец, фалькларыст, педагог. Заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі (1991). Доктар мастацтвазнаўства (1972). Прафесар (1974). Дзяржаўная прэмія Беларусі 1998. Скончыла Бел. харэаграфічнае вучылішча (1954), БДУ (1960). У 1954—61 салістка Дзяржаўнага тэатра оперы і балета Беларусі. З 1963 у Інстытуце мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН Беларусі, выкладчык Бел. кансерваторыі, з 1972 заг. кафедры Мінскага педагагічнага інстытута, з 1979 Бел. універсітэта культуры (да 1995), адначасова з 1994 у Бел. акадэміі музыкі (з 1995 заг. кафедры). Сярод выкананых партый: Насця («Падстаўная нявеста» Г.Вагнера) і інш. Працы па гісторыі і тэорыі бел. харэаграфіі, нар. танца: «Беларускі балет» (1966), «Беларускі сцэнічны танец» (1969), «Беларускі народны танец» (1972), «Беларускі балетны тэатр» (1983), «Беларускі балет у асобах» (1988), «Беларускі харэаграфічны фальклор» (1990), «Лінія, што ідзе ў бясконцасць» (1999). Сааўтар кніг «Музычны тэатр Беларусі, 1917—1959» (1993), «Музычны тэатр Беларусі, 1960—1990: Балет...» (1997). Аўтар лібрэта да балета «Кругаверць» А.Залётнева (адначасова адзін з пастаноўшчыкаў) і інш. Арганізатар і кіраўнік навукова-даследчай лабараторыі танцавальнай творчасці пры Мінскім інстытуце культуры (1980—90). Аўтар сцэнарыяў, у т.л. дакументальных тэлефільмаў, вядучая тэлеперадач пра мастацтва танца.

*Літ.*: Ю.М.Чурко: Бібліягр. паказ. Мн., 1998.



*Ю. М. Чурко.*

**ЧУРЫЛА́ЎСКІ НАРО́ДНЫ ФАЛЬКЛО́РНЫ КАЛЕКТЫ́Ў «КРЫНІ́ЦА»** сельскага Дома культуры Бешанковіцкага раёна. Заснаваны ў 1985, з 2003 народны. Кіраўнік — Т.Дзятлава. Інструментарый складаюць баян, гармонік, цымбалы, домра, ударныя інструменты. У рэпертуары мясцовыя нар. песні каляндарна-абрадавага (калядныя — «Го-го-го, каза», «На нова лета хай родзіць жыта»; масленічныя — «Чаго табе, каўзель, ды не сем нядзель»; валачобныя — «Гаспадарочак, як галубочак», «Пад вакном іду, кладачку машчу», «А тапу-тапу каля дарожкі», «Ляцела мова размавістая», «Хадзіў сам Бог па ўсім свеце»; купальскія — «А на Купалу рана сонца іграла», «Ой, рана, на Йвана»; пакроўскія — «Вось Пакрова прыйшла», «Ой, на Пакрову ночка цёмна») і сямейна-бытавога (заручальныя — «Гарэла сосна, палала», «Тонкая сасёнка»; хрэсьбінныя — «Садавая яблынька», «Дзякуй таму кавалю», «Наша бабка надпіла», «А учора мае кумачкі» і інш.) цыклаў. Адноўлены абрады і святы Асяніны, валачобны, Заручыны, Каляды, Купалле, Масленіца, Саракі, Спас, Пакроў, Хрэсьбіны. Калектыў — удзельнік рэспубліканскіх фестывалю нар. мастацтва «Беларусь — мая песня» (1997—98), свята «Дажынкі» (г. Полацк, 2002). Выступаў на Бел. тэлебачанні.



***Чурылаўскі народны фальклорны калектыў «Крыніца».***

*А. І. Гурчанка.*

**ЧУ́ЧАЛА**, антрапаморфны персанаж каляндарна-абрадавай практыкі беларусаў. Знаходзіцца ў такім шэрагу з'яў фалькл.-абрадавага універсуму, як Маскіраванне (гл. *Маска абрадавая*), *Пераапрананне*, ролевыя гульні сакральна-рытуальнага характару. У каляндарных святкаваннях сустракаліся два варыянты Ч.: зробленае з саломы леташняга ўраджаю ў рост чалавека, і лялька, якую маглі рабіць з саломы, побытавых падручных матэрыялаў (пакулле, палатно, морква, буракі, качалка і інш.). Функцыянальнае значэнне падобных антрапаморфных выяў і адначасова традыцыя Пераапранання, выварочвання адзення і Маскіравання тлумачыцца

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ